*паэты планеты*



# Аляксандр Блок

## Выбраная паэзія

*Пераклад з рускай*
*Георгія Ліхтаровіча*

Мінск
УП «Энцыклапедыкс»
2023

УДК 821.161.1-1
ББК 84(4Рус)-5
Б70

Серыя заснаваная ў 2016 годзе.

Рэдкалегія серыі:

Л. Баршчэўскі, Зм. Колас, І. Крэбс,
Г. Ліхтаровіч, А. Хадановіч, Г. Янкута

Пераклад зроблены паводле выдання:
*Собрание сочинений в шести томах.*
Ленинград : Художественная литература. 1980.

**На вокладцы:**

*К. Я. Сомаў,*
*Партрэт Аляксандра Блока (1907).*

**ISBN 978-985-7247-65-3**

©Ліхтаровіч Г., пераклад на беларускую мову, 2023.
©Дызайн серыі. Русецкі М. І., 2016.
©Афармленне. УП «Энцыклапедыкс», 2023.

***

*(Есть в дикой роще у оврага...)*

Лагчына ў цёмных нетрах гаю,
Зялёны груд. Там цень заўжды.
Пяе крыніц вада жывая,
Цурчанне ленае хады.
Трава і зёлкі пакрываюць
Суздром зялёную граду.
Тут сонца прамяні не граюць
І не трапляюць на ваду.
Не стануць і кахання сведкі
Заглядваць у халодны змрок.
Сказаць, чаму не вянуць кветкі,
Чаму не сціх крыніцы ток? –
Глыбока там, пад каранямі
Ляжаць пакуты ўсе мае,
Сілкуюць вечнымі слязамі,
Афелія, вянкі твае!

*1898*

***

*(Зачем, зачем во мрак небытия...)*

Нашто, нашто ў цямрэчу, небыццё
Мяне так цягнуць лёсу ўдары?
Ці праўда ўсё, і ўласнае жыццё –
Адны імгненні доўгай кары?
Я жыць хачу, хоць шчасця не было,
Няма чым сэрцу весяліцца,
Ды ўсё наперад мкне мяне святло,
І быццам ім магу свяціцца!
Хай прывідныя тыя прамяні!
І ўсе надзеі непрыдатны!
Але ў зямной, будзёнай мітусні,
Ярчэюць прамяні выдатна!

*1899*

***

*(Город спит, окутан мглою...)*

Горад спіць, спавіты мглою,
Ледзь ярчэюць ліхтары...
Там далёка, за Нявою,
Бачу водбліскі зары.
У далёкім люстраванні,
У начы на самым дне
Днее стоенае ранне
Дзён тужлівых для мяне...

*1899*

***

*(На небе зарево. Глухая ночь мертва...)*

Зара на небе. Мёртва глухне ноч.
Грувасціцца навокал дрэў лясных грамада,
Ды ясна гукі чуюцца наўзбоч
Далёкага, нязнанага нам града.

Ты запрыкмеціш рад цяжкіх дамоў,
І вежы, і зубцы байніц яго суровых,
І цёмныя сады між камянёў муроў,
І сцены гордых гмахаў шматвяковых.

Выразна так з глыбінь сівых вякоў
Рыхтуе розум лёс да адраджэння –
Забыты гул загіблых гарадоў,
Сапраўднасці зваротнае імкненне.

*1900*

***

*(Не доверяй своих дорог...)*

Не давярай гасцінец свой
Гурме падлізнікаў тандэтных:
Яны разбураць твой пакой,
Ахвярнік згасяць запаветны.

А духам моцныя – адны
З арды няўдалае збягаюць,
Адны запальваюць агні,
Заслоны цемры раздзіраюць.

*1900*

***

*(Увижу я, как будет погибать...)*

Убачу я, як будзе паміраць
Сусвет, радзімая краіна.
Я буду сам трыумфаваць
На трызне жудаснай айчыны.

Самотны лёс, ды радасны мой век,
Знішчэнне любячы, як мэту.
Як ні адзін вялікі чалавек,
Я сведка гібелі Сусвету.

*1900*

***

*(Измучен бурей вдохновенья…)*

Стамлёны бураю натхнення,
Апалены зямным агнём,
З халоднай смагай адкуплення
Я стукаўся ў гасподні дом.
Паганец стаў хрысціянінам –
Увесь паранены, спяшаў
Абрынуць ніц перад Адзіным
Парэшткі сіл, што захаваў.
Я стукаўся да ідэалу,
Няма адказу… А ў быллі
Мільгае, вабіць пакрывала
Дарма пакінутай зямлі…
Гасподзь не адказаў малітве,
Ды чую – страсных дзён настрой
Дыхнуў параненаму ў бітве,
І зноў жыве ў душы маёй.
Мне невядома шчасце раю,
Наступны змрок, магільны жаль…
Назад! Паганка маладая
На дружалюбны кліча баль!

*1900*

***

*(Я шел во тьме дождливой ночи...)*

Я йшоў у цьме дажджлівай ночы
І ў доме даўнім, ля акна,
Пазнаў задумлівыя вочы
Маёй тугі. – Яна адна
Ў слязах глядзела ў даль сырую...
І я вачэй не адрываў,
Як быццам маладосць былую
Ў абрысах твару я пазнаў.
Сцяло мне сэрца, як зірнула,
Агонь прыгас – і рассвіло.
Сырая раніца гукнула
Ў пакінутае часам шкло.

*1900*

***

*(Белой ночью месяц красный...)*

Белай ноччу месяц ясны
Выплывае ў сіняве.
Бродзіць прывідна-прыўкрасны,
І люструецца ў Няве.

Мне і мроіцца, і сніцца
Выкананне тайных дум.
Ці ў вас добрае таіцца,
Ясны месяц, ціхі шум?

*1901*

***

*(Ветер принёс издалёка...)*

Ветрык навеяў здалёку
Песні вясновай намёк,
Светла, узнёсла, глыбока
Неба адкрыўся шматок.

І ў той блакітнай віхуры,
Прыцемках блізкай вясны,
Плакалі зімнія буры,
Рэялі зорныя сны.

Боязна, цёмна, глыбока
Плакалі струны мае.
Ветрык навеяў здалёку
Звонкія песні твае.

*1901*

## *Ноч на Новы год*

*(Ночь на Новый год)*

Ляжаць халодныя туманы,
Гарацць барвовыя кастры.
Душа марозная Святланы
Гульнёю з марамі гарыць.

Рыпне снег – і сэрцы б'юцца –
Зноўку ціхі веташок.
Па-за брамкаю смяюцца,
Вулку атуляе змрок.

Дай зірну на свята смеху,
Уніз сыду, спыню спалох!
Стужка рдзяная – не ўцеха,
Мілы ступіць на парог...

Ды туман не варухнецца
Да паўночнае пары.
Хтосьці шэпча і смяецца,
І гараць, гараць кастры...

Рыпне крок – у зябкай далі
Крадзецца святліста снег.
Міма санкі праляталі...
«Ваша імя?» – Толькі смех...

Ды ўзляцеў віхор самотны,
І збялела ўсё, бы ў сне...
Нехта ўсмешны і пяшчотны
Закрывае вочы мне...

Ляжаць халодныя туманы,
І бледны месячык мігціць.
Душа задумлівай Святланы
Цудоўнай крозаю трымціць...

*1901*

***

*(Бегут неверные дневные тени...)*

*С. Салаўёву*

Заднéў прывідных ценяў абрыс хлюпкі.
Узнёслы і прызыўны кліч званоў.
Азораны царкоўныя прыступкі,
Яны тваіх чакаюць ступакоў.

Ты пройдзеш тут, кранеш граніт халодны,
Убраны страшнай святасцю вякоў,
Пакінеш, можа, квет вясны нязводны
Тут, у імгле, ля строгіх абразоў.

Ружовыя растуць няўцямна цені,
Узнёслы і прызыўны кліч званоў,
Плыве імгла на даўняе каменне...
А я тваіх чакаю ступакоў.

*1902*

***

*(Сны раздумий небывалых...)*

Сны развагаў небывалых
Сцерагуць мой дзень.
Позніх бачанняў няўдалых
Палымнее цень.

Прамяні маёй свабоды
Чырванелі там.
Тут снягі і непагоды
Атачылі храм.

Ці паверу ў тую мэту,
Што наўскач ляціць?
Ды магу Ўладарцы свету,
Прыгажосцю запавету,
Выпадковы і тандэтны
Я ўлюбёнцам быць.

Дні спатканняў нечаканых
Сцерагуць спакой...
Ці чакаць час палымяны
Справы маладой?

Ці, застыўшы ў снежным храме
Ў кроку ад вянца,
Шлюбнымі сустрэць дарамі
Вестуноў канца?

*1902*

***

*(Я медленно сходил с ума...)*

Я ціхавольна вар'яцеў
Каля дзвярэй той, што я прагну.
Вясновы дзень у ноч сацьмеў,
Якая распаляла смагу.

І жарсць даводзіла да слёз,
І стогны заглушаў я сумна.
Падвойвала ўва мне псіхоз,
Хварэючы вар'яцтвам, дума.

Яна працяла цішыню
Маёй душы, зноў неразумнай,
І заліла маю вясну
Чарнюткай хваляю бясшумнай.

Вясновы дзень у ноч сацьмеў,
Сцяў холад сэрца над магілай.
Я бажавольна вар'яцеў,
Я думаў холадна аб мілай.

*1902*

***

*(Весна в реке ломает льдины...)*

Вясна ў рачулках крышыць крыгі,
Мой не па мілых мёртвых жаль:
Адолеўшы вяршынь адлігі,
Забыў сівой зімы вярыгі
Блакітную заўважыў даль.

Што шкадаваць пра дым пажару,
Што каля крыжа бедаваць,
Калі магу штодзённа ўдару
Або чароўнейшага дару
З Майсеева куста чакаць!

*1902*

***

*(Днем вершу я дела суеты...)*

Днём завершу шмат справаў пустых,
Вечар свой я даверу агню.
Безвыходна туманная – ты
Ладзіш перада мною гульню.

Я люблю як ману, як гратэск,
Твой прывабны дзявочы нарад,
Вечны гоман і вулічны трэск,
Ліхтароў, што шыхтуюцца ў рад.

Я люблю, захапляюся, жду
Пераліўчатых фарбаў і слоў.
Падыду, але зноў адыду –
У прадонне замроеных сноў.

Як ілжыва наскрозь твая бель!
Мне ж па сэрцы хлусні белы схоў...
Завяршаючы дня каніцель,
Веру – прыйдзеш увечары зноў.

*1902*

***

*(Люблю высокие соборы...)*

Люблю ў высокія саборы,
З душой ціхмянай, завітаць,
На змрочныя ўзыходзіць хоры
І сярод кантараў знікаць.

Баюся я душы двудушнай
Таму абачліва ганю
Свой воблік д'ябальскі і скрушны
Ў святую гэтую браню.

У прымхлівай сваёй малітве
Хрыста прашу, каб бараніў,
Але з-пад маскі крывалікай
Хлуслівы смех пачуты быў.

І новы воблік цішу ганіць,
Мігціць змярцвелы свечак зман,
Буджу я аб Двудушным памяць
У сэрцах верных прыхаджан.

Вось – задрыжалі, змоўклі хоры,
Спалохам сталі ўцякаць...
Люблю ў высокія саборы,
З душой ціхмянай, завітаць.

*1902*

***

*(Свобода смотрит в синеву...)*

Глядзіць свабода ў сіняву.
Акно наросхрыст. Водар ветру.
Ў чырвона-жоўтую канву
Лістоты занурыўся ветах.

Ён будзе ноччу – светлы серп,
Зіхцець на цёмнай пожні ночы.
Яго заход, нібыта смерць,
Апошнім разам лашчыць вочы.

Як і тады, звініць акно.
Ды голас мой, як ветрык свежы,
Прапеў даўно і змоўк даўно
Пад трыснягамі на ўзбярэжжы.

Як ветах бледны ў сіняве,
Як залаціцца тонкі волас...
Як там трымціць у мураве
Забыты, бляклы, мёртвы колас...

*1902*

***

*(Плачет ребенок под лунным серпом...)*

*Я. П. Іванову*

Плача дзіця. Цьмее ветах сярпом.
Цягнецца ў полі вандроўнік гарбаты.
Гаем рагоча над круглым гарбом
Хтосьці калматы, крывы і рагаты.

Полем дарога імкне ўдалячынь.
Бледныя дзеўкі хаваюцца ў травы.
Рукі – пяшчотныя травы начы.
Вецер іх гойдае ўлева і ўправа.

Шэпча, гуляе трава сінявой.
Танчыць гарбун пад лампадай двухрогай.
Хтосьці заве серабрыстай трубой.
Хтосьці азоранай мкнецца дарогай.

Бледныя дзеўкі прыўзняцца змаглі.
Рукі ўзнялі да спазнання, маўчання.
Вухам прыпаўшы да цёмнай зямлі,
Сцяўся гарбун, затаіўшы дыханне.

Ціха касматы ў гаёчку дрыжыць.
Месячык здолеў у зёлкі залегчы.
Плача дзіцёнак. І вецер маўчыць.
Блізка труба. І не бачна ў цямрэчы.

*1903*

***

*(– Все ли спокойно в народе?..)*

– Ці ўсё спакойна ў народзе?
– Не. Імператар сканаў.
Нехта аб новай свабодзе
Некалі ўжо размаўляў.

– Ці ўсе гатовы падняцца?
– Не. Камянеюць і ждуць.
Нехта сказаў дачакацца:
Бродзяць і песні пяюць.

– Хто ж апынуўся ва ўладзе?
– Ўлады не прагне народ.
Дрэмле ў народзе бязладдзе:
Чуецца чыйсьці прыход.

– Хто ж ён, народны «збавіцель»?
– Лютасць і зло цёмных скрэп:
Мніх каля брамы ў абіцель
Бачыў яго – і аслеп.

Ён жа ў нязнанаю бездань
Гоніць – людзей не шкада...
Кіем лупцуе жалезным...
– Божа! Бяжым ад Суда!

*1903*

## *Балотны попік*

*(Болотный попик)*

На праталінцы слабенькай
За вячэрняй малітвай – маленькі
Попік балотны віднеецца.

Чэзлая раска таропка
Чарнеецца
Ледзь прыкметнаю кропкай.

І ў бязбурнасці зор заалелых
Не відаць чарцянят ашалелых,
Ды вячэрнія чары
Абвілі ўкруг яго свае тонкія рукі...
Надвячэрнія гукі –
Лёгкай парай.

Ціхамірна ён моліцца,
Усміхаецца сонечна,
Прыўзнімаючы шапку.

І жабульцы малой, што кульгае,
Зёлкай лекавай з гаю
Перавяжа хворую лапку.
Перахрысціць і пусціць гуляць:
«Вось, ідзі ты ў радзімую гаць.

Душа мая рада
І кожнаму гаду,
І ўсякаму зверу
Ўсялякае веры».
І ціхенька моліцца,
Здымаючы шапку,
За сцябло, што кволіцца,
За звярыную хворую лапу,
І за рымскага папу.

Не палохайся бездані й трасцы –
Твой ратунак у чорнае расцы.

*1905*

***

*(Болото – глубокая впадина...)*

Балота – глыбокая ўпадзіна
Вялізнага вока зямлі.
Ён плакаў так доўга,
Што слязамі сплыло яго вока
І чэзлай травой парасло.
Ды праз травы і зёлкі,
І праз пух белых веяў самкнутых
Прабягае зялёная іскра,
Каб ізноў у балоце пагаснуць.
І тады ходзяць-кажуць па вёсках
Ведзьмакі і калматыя ведзьмы,
Што ўзяліся нязнана адкуль:
«Так балота з вас, людцы, жартуе.
Сіла цёмная гэтак вас вабіць».
І калі яны гэта кажуць –
Хто стары, той жагнаецца пудка,
Пажылы хто, звычайна смяецца,
А ў дзяўчат – ясна бачныя крылы
За плячыма бялюткія ззяюць.

*1905*

## ***Восеньская воля***

*(Осенняя воля)*

Я выходджу ў шлях наўсцяж адкрыты,
Вецер хіліць пругкія кусты,
У траве па схілах камень біты,
Жоўтай гліны бедныя пласты.

Восень загуляла ў мокрых долах,
Агаліла могілкі зямлі,
Ды густых рабін у сумных сёлах
Яркі колер спее на галлі.

Вось яна, мая весёласць, скача
І звініць, знікаючы ў кустах!
І ўдалечыні прыемна бачыць
Рукава расквечанага ўзмах.

Хто пазваў мяне на шлях знаёмы,
Хто ўсміхнуўся мне ў акно турмы?
Мо' – каменным бальшаком вядзёны
Пабіраха, што пяе псалмы?

Не, я ў гэты шлях нікім не званы,
Хай ён будзе лёгкі і прамы!
Буду слухаць голас Русі п'янай,
Адпачыўшы пад страхой карчмы.

Ці спяю я пра ліхую ўдачу,
Як юнацтва ў хмелі загублю...
Над сумотай ніў тваіх я плачу,
І абшар навекі твой люблю...

Колькі нас – свабодных, юных, мажных –
Аж да скону могуць не любіць...
Прытулі ты ў далях неабсяжных!
Без цябе як плакаць мне і жыць!

*1905, Рагачоўская шаша*

***

*(Девушка пела в церковном хоре...)*

Дзяўчына спявала ў царкоўным хоры
Пра ўсіх знямоглых ў чужых краях,
Пра ўсе караблі, якія ў моры,
Пра ўсіх, кім забытая радасць свая.

Ляцеў яе голас пад самы купал,
Ззяў промень святла на яе плячы,
І кожны са змроку глядзеў і слухаў,
Як белая сукня ў святле гучыць.

І ўсім здавалася, радасць будзе,
Што ў ціхай завадзі ўсе караблі,
Што на чужыне знямоглыя людзі
Светлыя лёсы сабе знайшлі.

Салодкім быў голас, праменьчык – тонкім,
Адно ля Царскіх Дзвярэй з вышыні
Датычны Тайнаў, – быў плач дзіцёнка
Аб тым, што не прыйдуць назад яны.

*1905*

***

*(Утихает светлый ветер...)*

Аціхае светлы вецер,
Надыходзіць шэры вечар,
Крук уссеўся на сасну,
Сонную крануў струну.

У краях чужых і гіблых
Як ты ўспомніш пра мяне?
Аб маёй любові сціплай
Ці засмуцішся ты ў сне?

Хай душа твая імгненна –
Над табой заўжды, нязменна
Гордасць юная твая,
Вернасць дзеўчыны – мая.

Не гані, хоць ён і міма,
Прывід лёгкі, ды не свой,
Калі знойдзеш, мой любімы,
Шчасце з дзеўчынай другой...

Ну, дык з богам! Вечар блізкі,
Быстры лёт касатак нізкі,
    Навальніца ўжо грукоча,
    Ноч табе глядзіць у вочы.

*1905*

***

*(Ты проходишь без улыбки...)*

Ты праходзіш без усмешкі,
Апусціўшы вейкі долу,
І ў сутонні над саборам
Залацяцца купалы.

Як жа ты сама падобна
Да вячэрніх багародзіц,
Тых, што вейкі апускаюць,
Прападаючы ў імгле...

Ды з табою кучаравы
Хлопчык сціплы ў шапцы белай,
Ты вядзеш яго за ручку,
Аступіцца не даеш.

Я каля партала ў цені,
Там, дзе дзьме вятрыска рэзкі,
Што напружаныя вочы
Засцілае ўсцяж слязьмі.

Я хачу раптоўна выйсці,
Каб усклікнуць: «Панна Маці!
Для чаго ў мой чорны горад
Немаўля Ты прывяла?»

Ды язык не ў змозе крыкнуць.
Ты праходзіш. За табою
Над свяшчэннымі слядамі
Спачывае сіні змрок.

Я гляджу і ўспамінаю,
Як глядзелі вейкі долу
Як у белай шапцы хлопчык
Усміхнуўся да цябе.

*1905*

## *Снежнае віно*

*(Снежное вино)*

І зноў, бліснуўшы з чары віннай,
Ты пасяліла ў сэрцы страх
Сваёй усмешкаю нявіннай
У цяжказмейных валасах.

Куляюся ў струменях стрункіх,
Зноў удыхаю кагадзе
Забыты сон аб пацалунках,
Аб снегавеі ўкруг цябе.

І ты смяешся дзіўным чынам,
Змяішся ў чары залатой,
А па-над футрам сабаліным
Гуляе вецер сінявой.

Як, гледзячы ў струменяў промні,
Не ўбачыць пад вянцом сябе?
Як пацалункаў тых не ўспомніць
І твар узнёслы ў варажбе?

*1906*

***

*(Ночь. Город угомонился...)*

Ноч. Горад уціхамірыўся.
За вялікім акном
Ціха і ўрачыста,
Як быццам чалавек памірае.
Але там стаіць проста сумны,
Засмучаны няўдачай,
З адкрытым каўняром,
І глядзіць на зоркі.
«Зоркі, зоркі,
Раскажыце прычыну суму!»
І глядзіць на зоркі.
«Зоркі, зоркі,
Адкуль такая туга?»
І зоркі распавядаюць.
Усе распавядаюць зоркі.

*1906*

## ***Незнаёмка***

*(Незнакомка)*

Па вечарах над рэстаранамі
Паветра сквар здзічэў, аглух,
І правіць вокрыкамі п’янымі
Вясновы і тлятворны дух.

А ў далечы, дзе пыл завулачны,
Над сумам загарадных дач,
Ледзь залаціцца крэндзель булачнай,
І чуецца дзіцячы плач.

І кожны вечар, за шлагбаўмамі,
Заломваючы кацялкі,
Сярод канаў гуляюць з дамамі
Адпетыя жартаўнікі.

Над возерам рыпяць уключыны.
І чуецца жаночы віск,
А ў небе, да ўсяго прывучаны
Бяздумна крывіць вусны дыск.

І кожны вечар друг адзіны мой
У шклянцы бачыцца са мной,
Праз таямнічы і ліхі напой
Як я, з пакорлівай душой.

А побач ля суседніх столікаў
Лакеі сонныя тырчаць,
І стала купкі алкаголікаў
«In vino veritas!» крычаць.

І кожны вечар, ў час прызначаны
(Ці гэта толькі сніцца мне?),
Дзявочы стан, шаўкамі значаны
Імкне ў туманістым акне.

І, праплываючы між п’янымі,
Без спадарожнікаў, адна,
Парфумай пахнучы й туманамі,
Яна сядае ля акна.

І веюць даўнімі павер’ямі
Яе крамяныя шаўкі,
І капялюш з жалобным пер’ем, і
Ў пярсцёнках рух яе рукі.

І дзіўнай блізкасцю закаваны,
Гляджу на цёмную вуаль,
І бачу бераг зачараваны
І зачараваную даль.

Глухія тайны мне даручаны,
Чыёсьці сонца заадно,
І лукі ўсе душы замучанай
Працяла даўкае віно.

І пёры страўса нахілёныя
У мозгу тоўпяцца маім,
І вочы сінія бяздонныя
Цвітуць на беразе, на тым.

Скарбонка ў сэрцы захаваная,
Ключ дадзены выключна мне!
І сапраўды, пачвара п’яная!
Я помню: ісціна ў віне.

*1906*

***

*(Я ухо приложил к земле...)*

Я вуха да зямлі туліў.
Я мукі не парушу крыкам.
Душу ты стогнам надта хрыплым
Бяссмертную ў імгле таміў!
Паўстань ды запалі агні!
Гэй, уздымі свой верны молат,
Каб сцяць маланкаю, як волат,
Той змрок, дзе не відаць ані!
Ты рыешся, падземны крот!
Я чую цяжкі, хрыплы голас...
Спяшайся. Помні: слабы колас –
Сякеры іхняй умалот...
Зямлю злабы як зерне рый
І на святло выходзь. З умовай:
За перамогай выпадковай
Раіцца морак грабавы.
Ты песці навіну ізноў,
Міне вясна – над навіною,
Напітая тваёй крывёю
Саспее новая любоў.

*1907*

## *У кутку канапы*
*(В углу дивана)*

Ды ў каміне дазвінелі
Вугалькі.

За акенцам дагарэлі
Аганькі.

І на бурным моры тонуць
Караблі.

Над паўднёвым морам стогнуць
Жураўлі.

Больш не мае сонца, верце,
Гэты свет.

Вер і ты, начное сэрца,
Я – паэт!

Я якія хочаш казкі
Раскажу

І якія хочаш маскі
Пакажу.

І любыя пройдуць цені
Пры агні,

Дзіўных прывідаў трымценні
Не міні.

З кветкай хто заўгодна ўкленчыць
Прад табой...

На блакіт яна заменіць
Колер свой...

*1907*

## ***Пад маскамі***
*(Под масками)*

А было пад маскай зорна.
Усміхалася аповесць,
Бавілася ціха ноч.

І сумленне, думаў доблесць,
Дзесьці над прадоннем чорным,
Час выводзіла наўзбоч.

І ў руках трымаўся строма
Келіх вільгаці са шкла.
Ноч сплывала на харомы,
Цемрай ціха йшла.

Звонка бразгацелі мігі,
Вільгаць бразгалася ў сэрцы,
І дражніўся зайчык кволы
Ў галавешках крышталю.

І драмалі ў шафе кнігі.
Там – да старадаўніх дзверцаў
Прыляпіўся хлопчык голы
На адным крыле.

*1907*

## *Яны чытаюць вершы*

*(Они читают стихи)*

Глядзі: я ўсе старонкі зблытаў,
Калі зноў вочы расцвілі.
Сняжыстай птушкі ўзмахі крылаў
Мой розум дуйкай замялі.

Мне дзіўныя прамовы маскі!
Ці разумела ты іх? Ці?!.
Ты ўпэўнена, што ў кнігах – казкі,
І толькі проза – у жыцці.

Мне ж непадзельныя да сёння
З табою – ноч, імгла ракі,
Дымкі, што грэлі неба ўлонне,
І ўсмешных рыфмаў вугалькі.

Прасіць я аб лагодзе смею:
Ты цёмнай маскай не дражні,
Няхай і ў памяці сатлеюць
Не тыя – страшныя – агні.

*1907*

## ***На варце***

*(На страже)*

Я – непакорны і свабодны.
Я сам ладкую вольны лёс.
Ён – рэе па-над прорвай воднай
З трубой узнятай да нябёс.

Ён бачыць здрады ўсе і зманы,
Хвальба вядома і мальба.
За пеннаю градой туманнай
Ярчэе ўсцяж Яго труба.

Ён меч гартуе на рахункі
І пільны не скране пагляд,
Бо сцеражэ ўсе пацалункі,
Падзенні, клятвы, ганьбу звад.

Адказ праўдзівы – гэта мэта.
Уздыме Ён святлісты меч.
І кане цёмная камета –
У бездань новых цёмных стрэч.

*1907*

## *Тут і там*
*(Здесь и там)*

Вецер клікаў, гнаў пагоню,
Чорных масак не дагнаў...
Верныя былі ў нас коні,
Нехта белы памагаў...
Замятаў снягамі сані,
Коней голкамі дражніў,
Вежы будаваў з туману,
І кружыў, спяваў туманам,
І са снежнага бурану
Вокам цёмным варажыў.
І кідаўся вецер быстры
Па бур'янах,
І снапамі мчалі іскры
Па туманах, –
Вецер масак не дагнаў,
І з вышыняў срэбразорных
Хмару белую сарваў...
І ў адкрытых сініх прорвах

Сталі бачныя два цені,
Што зляталі ціха ў далі
Незнаёмай стараны...
Дзіўных сценяў летуценні
Ў чорных масках танцавалі –
Закахаліся яны.

*1907*

## *Асуджаны*
*(Обреченный)*

Сэрца тайна просіць гібелі.
Сэрца лёгкае, хадзі...
Вось з жыцця мяне і вывелі
Срэбрам снежнага пуці...

Як над той палонкай дальняю
Парыць ціхая вада,
Так у цішу развітальную
Завяла твая хада.

Сцяла і звяла паглядамі
І рукою абняла,
І халоднымі прыглядамі
Белай смерці аддала...

І ў якой другой абіцелі
Лёс цягнуць сваё ярмо,
Калі сэрца хоча гібелі,
Тайна просіцца на дно?

*1907*

## *У дзюнах*

*(В дюнах...)*

Я слоўніка пустога не люблю
Любоўных слоў і выразаў нямоглых:
«Ты мой», «Твая», «Люблю», «Навекі твой».
Я рабства не люблю. Паглядам вольным
У вочы прыгажуні я гляджу
І гавару ёй: «Сёння ноч. Ды заўтра –
Дзень зіхатлівы, новы дзень. Прыйдзі.
Ты, велічная страсць, мяне бяры.
А заўтра я пайду – і запяю».

Мая душа прамая. Брыз салёны
І смольны, узбярэжны дух сасны
Яе ўскарміў. І ў ёй – такія ж знакі,
Што і на твары збэшчаным маім.
Прыўкрасны я – жабрачай прыгажосцю
Паўночных мораў і зыбучых дзюн.

Так думаў я, блукаючы па межах
Фінляндыі, ўнікаючы ў гаворку
Нյголеных, зялёнавокіх фінаў.
Стаяла цішыня. І ля платформы
Цягнік гатовы ўжо раздзьмуў пары.
І мытная расейская ахова
Лянотна спачывала на пясчаным

Абрыве, дзе знікала палатно.
Так паўставала новая зямля.
І рускі беспрытульны храм глядзеў
На цалкам незнаёмую краіну.

Так думаў я. І вось яна прыйшла
І ўстала на адхоне. Панны вочы
Рудзеліся ад сонца і пяску.
І валасы, смалістыя як хвоі,
У сініх бліках падалі на плечы.
Прыйшла. І звераваты свой пагляд
З маім звярыным зіркам скрыжавала
І, смеючыся, кінула ў мяне
Пучок травы і залатую жменю
Пяску. Затым – ускочыла імкліва
І кумельгам зляцела пад адхон...

Я гнаў яе далёка. І падрапаў
Свой твар аб хвоі ды скрывавіў рукі.
Адзенне ўшчэнт падраў. Крычаў і гнаў
Яе, як звера, зноў крычаў і зваў,
І голас жарсці быў – як гукі рога.
А панна пакідала лёгкі след
У зыбкіх дзюнах, потым знікла ў хвоях,
Калі іх запляла начная сінь.

І я ляжу, запыханы ад бегу,
Сам, на пяску. У полымных вачах
Яшчэ бяжыць яна – і ўся рагоча:

Рагочуць валасы, рагочуць ногі,
Рагоча сукня, ўздзьмутая ад бегу...
Ляжу і думаю: «І сёння ноч,
І заўтра ноч. Я не пайду адгэтуль,
Пакуль не затраўлю яе, як звера,
І голасам, што кліча, быццам рог,
Не заступлю ёй шлях. І не скажу:
«Мая! Мая!» – І хай яна мне крыкне:
«Твая! Твая!»

*1907*

***

*(Я миновал закат багряный...)*

Я захад абмінуў барвяны,
Рады будынкаў, шэраг шпал,
Зайшоў у зманы і туманы, –
Агнямі бліснуў мне вакзал...

Я сцяты ціскам чалавечым,
Ледзь не адціснуты назад...
І вось – пагляд яе і плечы,
І чорных пёрак вадаспад...

Ступае ў час наканаваны,
Карл – цягне шлейфавы ядваб...
Услед гляджу я, закаханы,
Нібы на ката – цёмны раб...

Пагардаю мяне карае...
Праходзіць міма – не зірне,
І толькі карлік ролю грае –
Глядзіць з усмешкай на мяне.

*1908*

***

*(Когда вы стоите на моем пути...)*

Калі вы стаіце на маім шляху,
Такая жывая, такая прыгожая,
Але такая змучаная,
Гаворыце ўсё аб сумным,
Думаеце аб смерці,
Нікога не любіце
І пагарджаеце сваёй прыгажосцю –
Што ж? Хіба я пакрыўджу вас?

О, не! Бо я не гвалтаўнік,
Не ашуканец і не ганарлівец,
Хаця шмат ведаю,
Занадта шмат думаю з дзяцінства
І занадта заняты сабой.
Бо я – выдумшчык,
Чалавек, які заве ўсё па імені,
Які адымае водар у жывой кветкі.

Колькі ні кажыце пра сумнае,
Колькі ні разважайце аб канцах і пачатках,
Усё ж, я смею думаць,
Што вам толькі пятнаццаць год.
І таму я хацеў бы,
Каб вы закахаліся ў простага чалавека,

Які любіць зямлю і неба
Больш, чым рыфмаваныя і нерыфмаваныя
Прамовы аб зямлі і аб небе.

Праўда, я буду рады за вас,
Бо – толькі закаханы
Мае права на званне чалавека.

*1908*

***

*(Когда замрут отчаянье и злоба…)*

Калі замрэ шаленства скрухі злое,
Стуляе сон. Мы моцна спім абое
На розных полюсах зямлі.

Ты, можа, марыш пра мяне з нагоды,
Калі гадзіны йдуць хадой стагоддзяў,
І сны займаюцца калі.

І бачу ў снах твой вобраз, твой прыўкрасны,
Якім ён быў да ночы злой і страснай,
З'яўляўся ў сонныя віры…

Такая ж ты, якой цвіла калісьці,
Там, над гарой туманнай і скалистай,
У промнях ранішняй зары.

*1908*

***

*(О доблестях, о подвигах, о славе...)*

Аб доблесцях, аб подзвігах, аб славе
Я на зямлі гаротнай забываў,
Бо мілы твар у простае аправе
Перад сабою на стале трымаў.

Ды час настаў, пайшла ты ўпрочкі з дому.
Я кінуў запаветны персцянёк.
Ты аддала жаночы лёс другому,
І бачылася мне адно здалёк...

Ляцелі дні, круцілі клятым роем...
Віно і страсць звялі жыццё маё...
І ўспомніў я цябе ля аналою,
І зваў цябе, юнацтва зваў сваё...

Я зваў цябе, ты нават не зірнула,
Я слёзы ліў – насустрач не ішла.
Сябе плашчом ты сінім агарнула,
Пайшла ў сырую ноч з майго жытла.

Не ведаю, дзе гэту ганарыстасць
Ты, мілая, пяшчотная, знайшла...
Я моцна сплю, хоць плашч твой сіні сніцца –
Ты ў ім у ноч даждлівую сышла...

Што марыць аб пяшчоце і аб славе,
Усё мінула, маладосць прайшла!
Твой мілы твар у простае аправе
Сваёй рукой прыбраў я са стала.

*1908*

***

*(Она пришла с мороза...)*

Яна прыйшла з марозу,
Расчырванелая,
Напоўніла пакой
Водарам паветра і духоў,
Звонкім голасам
І зусім непаважлівай да заняткаў
Балбатнёй.

Яна неадкладна скінула на падлогу
Тоўсты том мастацкага часопіса,
І зараз жа стала здавацца,
Што ў маім вялікім пакоі
Вельмі мала месца.

Усё гэта было трошкі прыкра
І даволі недарэчна.
Зрэшты, яна захацела,
Каб я чытаў ёй уголас «Макбета».

Ледзь дайшоўшы да бурбалак зямлі,
Пра якія я не магу казаць без хвалявання,
Я заўважыў, што яна таксама хвалюецца
І ўважліва глядзіць у акно.

Аказалася, што вялікі стракаты кот
З цяжкасцю ціснецца па краі даху,
Падцікоўваючы галубоў, што цалуюцца.

Я раззлаваўся больш за ўсё на тое,
Што цалаваліся не мы, а галубы,
І што мінулі часы Паола і Франчэскі.

*1908*

***

*(Твое лицо мне так знакомо...)*

Твой мілы твар мне так знаёмы,
Як быццам ты жыла са мной.
На вуліцы, ў гасцях і дома
Цікую тонкі профіль твой.
Твая хада звініць за мною,
Куды я ні ўвайду, ты там,
Ты, пэўна, лёгкаю стапою
Вярэдзіш ціш маім начам?
Ці ты праслізгваеш, магчыма,
Ледзь толькі ў дзверы зазірну,
Ляціш паветраная міма,
Падобна бачанаму сну?
Я думаю, ці ў вольнай хвілі
Ты на кладах па-за гумном,
Сядзела, моўчкі на магіле,
Ахутаная паркалём?
Я набліжаўся – ты сядзела,
Я падышоў – ты адышла,
Ля рэчкі стала і запела...
На голас твой званоў хвала
Азвалася вячэрнім звонам...
І плакаў я, і цуд чакаў...

Ды за вячэрнім пераразвонам
Твой мілы голас аціхаў...
Яшчэ імгненне – без адказу,
Мільгае хустка за ракой...
Ды ведаю, хай не адразу,
Але мы ўбачымся з табой.

*1908*

## *Расія*

*(Россия)*

Як і ў часіны залатыя,
Тры сцёртых ляскаюць шляі,
І вязнуць спіцы распісныя
Ў расхлябаныя каляі...

Мая жабрацкая Расія,
Мне хаты шэрыя твае,
Твае мне песні ветравыя, –
Як слёзы, што любоў ліе!

Я шкадаваць цябе не ўмею
І крыж свой беражна нясу...
Якому хочаш чарадзею
Аддай разбойную красу!

Няхай прывабіць і падмане,–
Не прападзеш, не згінеш ты,
І толькі клопат затуманіць
Твае цудоўныя куты...

Ну што ж? Адной мітрэнгай болей –
Адной слязой рака шумней,
А ты ўсё тая ж – лес ды поле,
Да броваў – хустка паярчэй...

І немагчымае магчыма,
Бліжэй дарога для вазка,
Як блісне ў сумнай далячыні
Пагляд імгненны з-пад вянка,
Калі звініць тугой астрожнай
Глухая песня ямшчыка!

*1908*

***

*(Часовая стрелка близится к полночи...)*

Стрэлка цыферблата мкнецца да паўночы.
Светлая хвіліна ўсхвалявала свечкі.
Цёмная хвіліна ўсхвалявала думы.
З Новым годам, сэрца! Я люблю таемна,
Вечары глухія, вуліцы нямыя.
Я люблю таемна, цёмная сяброўка
Хібаў маладосці, былі дагарэлай.

*1908*

***

*(Я пригвожден к трактирной стойке...)*

Прыбіты да карчомнай стойкі.
Я п’ю даўно. Мне ўсё адно.
А шчасце вунь – разбегам тройкі
Ў срабрысты дым ляціць яно...

Ляціць на тройцы, патанула
І ў снег часоў, і ў даль вякоў...
Адно душу захаланула
Імжой срабрыстай з-пад падкоў...

Імкнуцца іскры ў цемрадзь ночы,
Праменяць цёплае святло...
Званочак пад дугой шапоча,
Аб тым, што шчасцейка прайшло...

І толькі збруя залатая
Звініць з відна і да відна...
А ты, душа... душа глухая...
Ты п’яная здавён-здаўна...

*1908*

***

*(Искусство – ноша на плечах...)*

Мастацтва – ноша на плячах,
Але як цэнім мы, паэты,
У дробязях знаёмы шлях
Лянотны, мімалётны гэты!

Чуць, як пульсуе ў жылах кроў,
Пераліваецца пявуча,
І жарсць, што дорыць нам любоў,
Злавіць за хмаркаю лятучай,

І мроіць, што турбот няма –
Жыццё ўстае ў шампанскім бляску,
Нібыта кот вуркоча казку,
Калі мільгае *cinema!*

Праз год – край незнаёмы мне:
Утома, горад невядомы,
Натоўп, – і зноў на палатне
Абрыс француженкі цудоўнай!

*1909*

***

*(Уж вечер светлой полосою...)*

Паўзмрок святлістай паласою
На рэйках стылых дагараў.
Ты, зграбная, з тугой касою
Прайшла па чорных плямах шпал.

Твой хуткі зірк агнём дакучным
Мяне апёк і асляпіў.
Імгненне... громам аднагучным
Цягнік нас чорны падзяліў...

А ў час, калі дрыготкім звонам
Прапелі рэйкі: не забудзь,
І семафор агнём зялёным
Мне паказаў свабодны пуць, –

Ты ўжо ішла да небасхілу,
Губляўся колер у травы...
Там пыл узвіўся, цьма ўступіла
Ў свае імглістыя правы...

Трывожны свіст і пасмы дыму
За паваротам на гары...
Дарэмны міг, які плыў міма...
Агонь зялёны на зары.

*1909*

***

*(Не спят, не помнят, не торгуют...)*

Не спяць, не помняць, не гандлююць.
Над чорным горадам, як стогн,
Стаіць і ноч ірве глухую
Ўрачысты велікодны звон.

Над існасцю людской пароды,
Якую ўбіў у тло магіл,
Над мукай, смерцю і смуродам
Б'юць у званы да страты сіл...

І над сусветнаю лухтою;
Над тым, чаму не памагчы;
Звіняць над шубкай футраною,
Была ў якой ты ў той начы.

*1909*

***

*(Как из сумрачной гавани...)*

Як са змрочнае гавані,
Ад радзімай зямлі
Ў кругасветнае плаванне
Адышлі караблі, –
Так і вы, мае
Залатыя гады –
У незваротнае
Адышлі назаўжды.

*1909*

***

*(Черный ворон в сумраке снежном...)*

Чорны крук у сутонні снежным,
Аксаміт на смуглявых плячах.
Млявы голас спевам кунежным
Мне пяе аб паўднёвых начах.

Бестурботнасць у сэрцы с запалам,
Быццам з мора далі мне знак.
Над бяздонным у вечнасць правалам,
Знемагаючы, мкне рысак.

Снежны вецер, тваё трымценне,
Ап'янелыя вусны мае...
Валянціна, зорка, трызненне!
Як спяваюць салоўкі твае...

Страшны свет! Ён для сэрца цесны!
Там – тваіх пацалункаў сакрэт,
Цёмны морак цыганскіх песень
І паспешлівы лёт камет!

*1910*

***

*(Знаю я твое льстивое имя...)*

Мне знаёма лісліваe імя,
Аксаміт чорны, вусны ў агні,
Ды стаіць за плячыма тваімі,
Што і мне невядома ані.

І вярэдзіцца ўпартая гнеўнасць
У мяне паміж броваў на лбе:
Паліць сэрца мне, чорная рэўнасць
Да зямлі, што належыць табе.

І, гатовы на новыя мукі,
Узгадаю завеі, снягі,
Твае дзікія слабыя рукі,
Мармытанняў тваіх жамчугі.

*1910*

***

*(В неуверенном, зыбком полете...)*

У няўпэўненым, зыбкім палёце
Ты над безданью ўзвіўся й павіс.
Нешта даўняе ў тым павароце
Мёртвых крыл, што загнутыя ўніз.

Як ты можаш лунаць, неба гушкаць
Без сябе, без душы, без любві?
О, стальная, бяздушная птушка,
Чым жа можаш тварца ты ўсхваліць?

У шэрых сферах туляйся і лётай,
Хай аркестр грыміць неўсупын,
Ды з вальсуючай музыкай лёгкай
Знерухоміцца сэрца – і вінт.

*1910*

***

*(Русь моя, жизнь моя...)*

Русь, век нам мучыцца разам ці раіцца?
Цар, ды Сібір, ды Ярмак, ды турма!
Эх, можа час разлучыцца, раскаяцца...
Вольнаму сэрцу нашто тая цьма?

Ведала што? А ці ў бога ты верыла?
Што там пачуеш са спеваў тваіх?
Чудзь начудзіла, ды Мера намерала
Гацей, дарог ды слупоў верставых...

Лодкі ды грады па рэках рубіла ты,
Ды да Царградскіх святынь не дайшла...
Сокалаў, лебедзяў стэпам пусціла ты –
Чорная лезе са стэпу імгла...

За мора Чорнае, за мора Белае
Ў чорныя ночы і ў белыя дні
Дзіка глядзіцца стварэнне знямелае,
Вочы татарскія сыплюць агні...

Ціхае, доўгае, чырвані зарыва
Кожную ноч па-над станам тваім...
Што ж ты маячыш, санлівае марыва?
Вольным гуляешся духам маім?

*1910*

***

*(Над лучшим созданием божьим…)*

Да лепшага боскага твору
Я зведаў магутнасць пагарды.
Я палкаю ўдарыў яе.

Адзелася спехам. Сыходзіць.
Пайшла. Азірнулася пудка
На шызыя вокны мае.

Няма яе. Шэрасцю ў вокны
Ўліваецца вечар пахмурны,
А далей, за цемрай нягоды,
Гарыць заравая кайма.

Сырыя, далёкія долы
І блізкае, бурнае шчасце!
Ды слухаю я ў адзіноце
Ўсё тое, што скрыпкі пяюць.

Пяюць яны дзікія песні
Аб тым, што свабодным я стаў!
Аб тым, што на лепшую долю
Я нізкую жарсць прамяняў!

*1910*

## *Знявага*

*(Унижение)*

Між сукоў голых дрэваў у хмарах
Зімні захад жаўцюткі, як дым.
(Вязняў да эшафота на кару
Павядуць адвячоркам такім).

Штоф канапаў лінялы, чырвоны,
Кутасы запылёных парцьер...
У пакоі, у шкляначным звоне,
Купчык, шулер, студэнт, афіцэр...

Гэтых голых малюнкаў нямала
Не людская кранала рука...
І падлюкі рука націскала
Гэту брудную кнопку званка...

Чуеш! Мякка пра звякалі шпоры,
Смех глухі з-за дубовых дзвярэй...
Хіба дом гэты – дом без дакоры?
Хіба так павялося ў людзей?

Ці я сённяшняй рады сустрэчы?
Што збялелы твой лік, быццам лёд?
Што ў тваe непрыкрытыя плечы
Захад холадам б’е навылёт?

Толькі вусны з запечанай кроўю
На іконе тваёй залатой
(Хіба гэта мы звалі любоўю?)
Сёння трызняцца рысай крывой...

Жоўтым захадам зімнім спакойна
Патануў (гэтак пышна!) алькоў...
Яшчэ цесна ўдыхаць ад абдоймаў,
А ты свішчаш ізноў ды ізноў...

Невясёлы твой свіст замагільны...
Чуеш! – шпор мармытанне ізноў...
Нібы змей, цяжкі, сыты і пыльны,
Шлейф спаўзае з фатэляў далоў...

Ты адважна! Стань болей бясстрашнай!
Я – не друг, не вянчаў нас і час!
Дык уткні, мой анёл учарашні,
Ў сэрца – вострых французскі абцас!

*1911*

***

*(Ночь, улица, фонарь, аптека...)*

Ноч, вуліца, ліхтар, аптэка,
Няўцямна-цьмянае святло.
Жыві яшчэ хоць чвэрць ад веку –
А будзе ўсё, як і было.

Памрэш – жыццё адновіш дбала
Ды атрымаеш той жа дар:
Ноч, зледзянелы зыб канала,
Аптэка, вуліца, ліхтар.

*1912*

***

*(Пустая улица. Один огонь в окне ...)*

Пустая вуліца. Адзін агонь ў акне.
Габрэй-аптэкар вохкае ўва сне.

А перад шафай з надпісам *Venena*[1],
Як гаспадар сагнуў скрыпучае калена,

Шкілет, да воч захутаны плашчом,
Ашчэрыў рот, шукае што крадком...

Знайшоў... Ды незнарок ён чымсьці рыпнуў,
І чэрап павярнуў... Аптэкар хрыпнуў,

Прыўстаў – і на другі зваліўся бок...
А госць між тым – жаданы пузырок

Збывае з-пад плашча жанчынам двум бязносым.
На вуліцы, пад ліхтаром бялёсым.

*1912*

[1] Атрута (*лац.*)

***

*(Благословляю все, что было...)*

Дабраслаўляю ўсё, што стала,
Я лепшай долі не шукаў.
О, сэрца, колькі ты кахала!
О, розум, колькі ты палаў!

Няхай і шчасце, і пакуты
Пакінулі свой горкі след,
Ні бурай, ні нудой не скуты –
Ранейшы я не страціў свет.

І ты, каго я мучыў новым,
Прабач мяне. Нам быць – ўдваіх.
А ўсё, чаго не скажаш словам,
Дазнаўся я ў вачах тваіх.

Глядзяць уважлівыя вочы,
Б'е ў сэрцы захаплення страх,
У зімнай цемры снежнай ночы
Працягваючы верны шлях.

*1912*

***

*(Ты говоришь, что я дремлю...)*

Ты кажаш мне, што я драмлю,
Ты зневажальна так рагочаш.
І ты мяне прымусіць хочаш
Сто раз сказаць табе: люблю.

Паўднёвы голас мяккі. Стан
Нагадвае мне стан газелі.
Мяне ж прынёс к табе буран
З краін, дзе снег сумёты сцеле.

Мне дзіўны вальса лёгкі звон
І душны воблак над табою.
Ты для мяне – цудоўны сон,
Празрыстай дымкай снегавою...

Па імені баюся зваць.
Не трэба мне яно, магчыма?
Дай мне трывожна сузіраць
Маімі прагнымі вачыма

Паўднёвы бляск, забыты мной,
Які нагадвае дарэмна
Дзень адляцелы, дзень прыемны,
Забіты ноччу снегавой.

*1913*

## ***Мастак***

*(Художник)*

Летам спякотным, зімою гаротнаю,
Цягам вясельных і горасных дзён,
Жду, каб спалохаў нудоту смяротную
Лёгкі, нячутны да гэтага звон.

Вось ён – узнік. І з халоднай увагаю
Жду, каб пазнаць, змацаваць і забіць.
І перад зоркім чаканнем з адвагаю
Цягне ён ледзьве прыкметную ніць.

З мора віхура? Ці сірыны райскія
Ў лісці пяюць? Ці сам час тут стаіць?
Ці ўжо абсыпалі яблыні майскія
Снежны свой цвет? Ці анёлак ляціць?

Цягнецца час, таямніца сусветная.
Шырацца гукі, імкненні, святло.
Ціснецца ў прышласць усё пракаветнае
Толькі сапраўднага – як не было.

Зараз, у межах зачацця замглёнага
Новай істоты, нязведаных сіл,–
Нішчыць душу, як грамамі, праклёнамі:
Творчы пачатак адужаў – забіў.

І замыкаю я ў клетку халодную
Лёгкую, добрую птушку свабодную,
Птушку, што смерць захацела стрымаць,
Птушку, што мкнула душу ратаваць.

Вось мая клетка – жалезная, крэпкая,
Як залатая, у цёплым святле.
Вось мая птушка, вясёлая некалі,
Любіць абруч, на аконцы пяе.

Крылы падрэзаны, песні завучаны.
Любіце вы пад акном пастаяць?
Спеў даспадобы. Я ж, вельмі замучаны,
Новага жду – зноў нуду не стрымаць.

*1913*

***

*(Земное сердце стынет вновь...)*

Зямное сэрца стыне зноў,
Бо сцюжа стукае мне ў грудзі,
Дзе я хаваю на бязлюддзі
Да ўсіх людзей сваю любоў.

Ды гнеў любоўю не стрымаць,
Расце пагарда і жаданне
Ў вачах усіх людзей чытаць
Пячаць нябыту ці абрання.

Хай кажуць мне: «Забудзь, паэт!
Жыві да ўтульнасці прыкуты!»
Не! Лепш у сцюжы згінуць лютай!
Не прызнае́ спакою свет.

*1911–1914*

***

*(Я – Гамлет. Холодеет кровь...)*

Я – Гамлет. Халадзее кроў,
Калі пляце падступства сеці,
І ў сэрцы – першая любоў
Жыве – да той адной на свеце.

Цябе, Афелію, звялі
Жыцця халодныя нябыты,
І гіну, прынц сваёй зямлі,
Клінком атручаным забіты.

*1914*

***

*(Грешить бесстыдно, непробудно...)*

Грашыць бяссонна, бессаромна,
Падлік згубіць начам і дням,
І, з галавой ад хмелю цёмнай,
Прайсці бачком у божы храм.

Трайны паклон адбіць з дарогі,
Сем раз – пазначыць крыж крадком,
Да запляванае падлогі
Гарачым дакрануцца лбом.

Адшкадаваўшы грошык медны,
Ці тры, ці сем раз акурат
Пацалаваць даўнішні, бедны,
Зацалаваны ўшчэнт, аклад.

А па-за храмам зноў абмераць
На той жа грош абы каго,
І пса галоднага за дзверы,
Ікнуўшы, выпіхнуць нагой.

І пад лампадай ля іконаў
Піць чай, рахункаў весці лік,
І пераслініць жмут купонаў
Каля камоды, бы даўжнік,

І на пярыны пухавыя
Ў мяртвецкім заваліцца сне...
Ды, і такой, мая Расія,
Ты даражэй за іншых мне.

*1914*

***

*(Ты жил один! Друзей ты не искал...)*

Ты жыў адзін! Сяброў ты не шукаў
І не шукаў ты аднаверцаў.
Ты востры нож бязлітасна ўтыкаў
У вольнае для шчасця сэрца.
«Вар'яцкі друг! Ты б мог шчаслівым стаць!..»
«Нашто? Між бураў і напасцяў
Не здольныя ўсё роўна захаваць
Мы вечнага, як неба, шчасця!»

*1914*

***

*(На улице – дождик и слякоть...)*

На вуліцы – дожджык і слота,
Не ведаеш, жыць ці блажэць?
Жадае заплакаць гарота,
І сілы няма дзе падзець.

Глухая туга без прычыны
І думак навязлівых сквар.
Давай мы наколем лучыны,
Раздзьмуем сабе самавар!

Авось, хоць за чайным пахмеллем
Бурклівыя словы мае
Зацепляць вясёласці хмелем
Дрымотныя вочы твае.

За вернасць старому абраду!
Каб жыць нетаропка спярша!
Авось, і распарыць нам зваду,
Пасёрбаўшы чаю, душа!

*1915*

## *Дэман*
*(Демон)*

Ідзі, ідзі за мной – пакорнай
І вернаю маёй рабой.
Я на бліскучы грэбень горны
Ўзлячу ўпэўнена з табой.

Я пранясу цябе над прорвай,
І буду безданню дражніць.
Ты застанешся мне пакорнай –
Твой жах адно мяне натхніць.

Я ад дажджу з эфірным пылам
І ад віроў абараню
Ўсёй сілай мышцаў, моцай крылаў
Цябе ўзнясу на вышыню.

І на гарах, у бляску белым,
На незаплямленым лужку,
Чароўна-вытанчаным целам
Цябе я дзіўна апяку.

Ты ведаеш, якая маласць
Мана нялюдская без меж,
І сумная зямная жаласць,
Што дзікай страсцю ты завеш?

Як вечар ахінецца цішай,
І, зачарованая мной,
Ты паляцець захочаш вышай,
Пустыняй неба агнявой, –

Так, я вазьму цябе з сабою
І падару табе прастор,
Дзе зорка бачыцца Зямлёю,
Зямля падобная да зор.

І, анямеўшы ад здзіўлення,
Другія светы ўгледзіш ты –
Мае дзівосныя стварэнні,
Гульню сузорнае слаты...

Тады ад страху і бяссілля,
Шапнеш ледзь чутна: адпусьці...
І, распусціўшы ціха крылле,
Табе ўсміхнуся: ну, ляці.

І пад усмешкай боскай, ціхай,
Знішчаючыся на ляту,
Ты паляціш, як камень зыбкі,
У агнявую пустату...

*1916*

## ***Каршун***

*(Коршун)*

Малюючы за кругам круг,
Каршун над сонным лугам кружыць,
Аглядвае пустынны луг. –
Над сынам маці ў хатцы тужыць:
«На хлеба, на, на грудзі ссі,
Расці, з пакорай крыж нясі».

Ідуць вякі, шуміць вайна,
Гудзе мяцеж, палаюць сёлы,
Краіна з ночы давідна
Ў красе адвечнай, невясёлай. –
Матулі колькі год тужыць?
І каршуну дакуль кружыць?

*1916*

***

*(«Мы были вместе, помню я...»)*

Былі мы разам, помню я...
Ноч хвалявала, скрыпка пела...
Ты ў тыя дні была – мая,
Ты з кожнай хвіляй прыгажэла...

У ціхае цурчанне бруй
Загадкай твой усмех туліўся.
Прасілі вусны: «Пацалуй!»
А ў сэрца – скрыпкі гук прасіўся...

*1899–1918*

## ***Скіфы***
*(Скифы)*

Панмангалізм! Хоць імя дзіка,
Але мне лашчыць слых яно.
*Уладзімір Салаўёў*

Мільёны – вас. Нас – цьмы, і цьмы, і цьмы.
Спрабуйце, пазмагацца з намі!
Так, скіфы – мы! Так, азіяты – мы,
З раскосымі і прагнымі вачамі!

Для вас – вякі, ваш час – нішто для нас.
Мы, як слухмяныя халопы,
Трымалі шчыт між дзвюх варожых рас –
Манголаў і Еўропы!

Вякі вам горан ваш стары каваў
І заглушаў грамы, лавіны,
І дзікай казкай быў для вас правал
І Лісабона, і Месіны!

Вы сотні год дзівіліся на Ўсход,
Збіраючы ўсе перлы нашы,
Лічылі час, калі пачаць паход,
Калі гарматамі застрашыць!

Вось – час настаў. Б’е крыламі бяда,
І кожны міг нам крыўды множыць,
Ды прыйдзе дзень – і будзе па слядах
Ад вашых Пестумаў, быць можа!

Пакуль жывы, утульны свет стары!
Пакуль салодкай млееш мукай,
Ты хоць і мудры, як Эдып, – замры
Прад Сфінксам з вечнаю дакукай!

Расія – Сфінкс. У радасці, журбе,
І абліваючыся кроўю,
Глядзіць, глядзіць, глядзіць яна ў цябе
З нянавісцю, але з любоўю!..

А так любіць, як любіць наша кроў,
Спрадвеку з вас ніхто не любіць!
Забыліся, што ў свеце ёсць любоў,
Якая паліць нас і губіць!

Мы любім і халодных лічбаў сквар,
І дзіва боскіх летуценняў,
Мы разумеем востры гальскі дар
І змрочнавокі гоцкі геній...

Мы ведаем парыжскіх вуліц жах,
Венецыянскія карцінкі,
Цытрынавых гаёў далёкі пах,
І Кёльна дымныя будынкі...

Мы любім плоць – прывабны смак яе,
Ды пах задушліва-смяротны...
Чыя віна, як хрусне ваш шкілет
У лапах цяжкіх і пяшчотных?

Бо звычна нам, хапаючы аброць
Натурыстых заўзятых коней,
Ламаць крыжы зацятым самахоць,
Ды сцішваць і рабынь свавольных...

Ад пострахаў вайны мы клічам прэч!
У мірныя абдымкі йдзіце!
Пакуль не позна – даўні ў ножны меч,
Сябры! Братамі нас лічыце!

А калі не – няма чаго губляць,
І нам даступна вераломства!
Вякі, вякі вас будзе праклінаць
Ужо нямоглае патомства!

Шырока мы па нетрах і лясах
Перад Еўропай яснатварай
Расступімся! Павернемся да вас
Сваёю азіяцкай харай!

Ідзіце ўсе, ідзіце на Урал!
Мы ачышчаем месца бою
Стальных машын, дзе разам інтэграл,
З мангольскай дзікаю ардою!

Мы вас не будзем бараніць сабой,
І ў гэты бой не ўступім самі,
Паглядзім, як кіпіць смяротны бой,
Сваімі вузкімі вачама.

Не зрушымся, калі люцейшы гун
У трупаў па кішэнях будзе шнарыць,
Паліць пасады, гнаць у храм табун,
І мяса белых смажыць-скварыць!..

Апошні раз – спыніся, свет стары!
На брацкі баль жыцця і міру,
Апошні раз на светлы баль, сябры,
Склікае варварская ліра!

*1918*

## ***З. Гіпіус***

*Пры атрыманні «Апошніх вершаў»*
*(З. Гиппиус – При получении «Последних стихов»)*

Гордая, жаноцкая дзівачка!
Зразумелы кожны ваш намёк,
Белая вясновая гарачка –
Звонкім гневам сціснуты радок!

Словы ўсе – нібы пагарды джала,
Словы ўсе – як колючая сталь!
Ядам набрынялага кінжала
Вастрыё цалую, бачу даль...

Але ў далі бачу – мора, мора,
Новых местаў велізарны план,
Голас ваш не чую ў грозным хоры,
Дзе гудзе і бесіцца ўраган!

Пэўна трэба, страшна, што глыбока,
Мне – занурвацца ў шматпенны вал,
Вам – наядаю зялёнавокай
Плёскацца каля ірландскіх скал.

Высака – над хвалямі – над намі, –
Як зара над чорнымі гарамі –
Вее сцяг – Інтэрнацыянал!

*1918*

***

*(Пусть рассвет глядит нам в очи...)*

Хай глядзіць світанне ў вочы,
Салавей начны пяе,
Хай рука хоць раз уночы
Стан твой гнуткі абаўе.

І пад калыханне чоўна
Ў доўгіх цёмных чаратах,
Ты прытулішся чароўна
З палкай жарсцю на губах.

Спеў кахання – спеў дароўны,
Голас льецца ўсё мацней,
Ты пяшчотней, ты цудоўней,
Чым паўночны салавей!..

*1898–1921*

# ЗМЕСТ

***(Лагчына ў цёмных нетрах гаю...)....................................5
***(Нашто, нашто ў цямрэчу, небыццё...) ...................6
***(Горад спіць, спавіты мглою...)......................................7
***(Зара на небе. Мёртва глухне ноч.) ............................8
***(Не давярай гасцінец свой...) ........................................9
***(Убачу я, як будзе паміраць...)......................................10
***(Стамлёны бураю натхнення...) .................................11
***(Я йшоў у цьме дажджлівай ночы...) ........................12
***(Белай ноччу месяц ясны...) .........................................13
***(Ветрык навеяў здалёку...)............................................14
Ноч на Новы год.......................................................................15
***(Заднеў прывідных ценяў абрыс хлюпкі...)............17
***(Сны развагаў небывалых...) .......................................18
***(Я ціхавольна вар'яцеў...)...............................................19
***(Вясна ў рачулках крышыць крыгі...).........................20
***(Днём завершу шмат справаў пустых...)....................21
***(Люблю ў высокія саборы...) .........................................22
***(Глядзіць свабода ў сіняву...).......................................23
***(Плача дзіця. Цьмее ветах сярпом.)............................24
***(– Ці ўсё спакойна ў народзе?)......................................25
Балотны попік...........................................................................26
***(Балота – глыбокая ўпадзіна...) .....................................28
Восеньская воля.......................................................................29
***(Дзяўчына спявала ў царкоўным хоры...) ..................31
***(Аціхае светлы вецер...) ..................................................32

***(Ты праходзіш без усмешкі...) .......... 33
Снежнае віно .......... 35
***(Ноч. Горад уціхамірыўся.) .......... 36
Незнаёмка .......... 37
***(Я вуха да зямлі тулiў.) .......... 40
У кутку канапы .......... 41
Пад маскамі .......... 43
Яны чытаюць вершы .......... 44
На варце .......... 45
Тут і там .......... 46
Асуджаны .......... 48
У дзюнах .......... 49
***(Я захад абмінуў барвяны...) .......... 52
***(Калі вы стаіце на маім шляху...) .......... 53
***(Калі замрэ шаленства скрухі злое...) .......... 55
***(Аб доблесцях, аб подзвігах, аб славе...) .......... 56
***(Яна прыйшла з марозу...) .......... 58
***(Твой мілы твар мне так знаёмы...) .......... 60
Расія .......... 62
***(Стрэлка цыферблата мкнецца да паўночы...) .......... 64
***(Прыбіты да карчомнай стойкі.) .......... 65
***(Мастацтва – ноша на плячах...) .......... 66
***(Паўзмрок святлістай паласою...) .......... 67
***(Не спяць, не помняць, не гандлююць.) .......... 68
***(Як са змрочнае гавані...) .......... 69
***(Чорны крук у сутонні снежным...) .......... 70
***(Мне знаёма ліслівае імя...) .......... 71

***(У няўпэўненым, зыбкім палёце...) ..........................72
***(Русь, век нам мучыцца разам ці раіцца?) ..............73
***(Да лепшага боскага твору...) .......................................74
Знявага........................................................................................75
***(Ноч, вуліца, ліхтар, аптэка...)........................................77
***(Пустая вуліца. Адзін агонь ў акне.)...............................78
***(Дабраслаўляю ўсё, што стала...) ..................................79
***(Ты кажаш мне, што я драмлю...)...................................80
Мастак.........................................................................................81
***(Зямное сэрца стыне зноў...)...........................................83
***(Я – Гамлет. Халадзее кроў...)..........................................84
***(Грашыць бяссонна, бессаромна...) ...............................85
***(Ты жыў адзін! Сяброў ты не шукаў...) ...........................87
***(На вуліцы – дождж і слота...).........................................88
Дэман ..........................................................................................89
Каршун ........................................................................................91
***(Былі мы разам, помню я...) .............................................92
Скіфы ...........................................................................................93
З. Гіпіус .......................................................................................97
***(Хай глядзіць світанне ў вочы...) ...................................98

**У серыі «Паэты планеты»,**
**акрамя «Выбранай паэзіі» Аляксандра Блока,**
**таксама выйшлі зборнікі такіх паэтаў, як:**

Сапфо
Франчэска Петрарка
П’ер дэ Рансар
Ўільям Шэкспір
Ёган Вольфганг Гётэ
Габрыэла Містраль
Умар Хаям
Шарль Бадлер
Райнэр Марыя Рыльке
Фрыдрых Гёльдэрлін
Генрых Гайнэ
Гіём Апалінэр
Эдгар По
Федэрыка Гарсія Лорка
Джон Кітс
Рыгор Барадулін
Дзімча Дэбялянаў
Гай Валерый Катул
Яраслаў Вырхліцкі
Ян Каханоўскі
Катры Вала
Канстандзінас Кавафіс
Барыс Пастарнак
Аляксандр Чакс
Хуан Рамон Хіменэс
Юлі Таўбін
Хаім Нахман Бялік
Баляслаў Лесьмян
Шандар Петэфі
Міхай Эмінэску
Ўільям Батлер Ейтс
Эмілі Дыкінсан
Алесь Разанаў
Мацуа Басё
Георг Тракль
Сяргій Жадан
Рабіндранат Тагор
Сэсар Вальеха
Сігб’ёрн Обстфельдэр
Томас Стэрнз Эльёт
Арцюр Рэмбо
Нікалоз Бараташвілі
Фрыдрых Шылер
Умбэрта Саба
Марк Валерый Марцыял
Ўолт Ўітмэн
Візма Бэлшавіца
Мікола Зэраў
Адам Міцкевіч
Юсцінас Марцінкявічус
Бгартрыгары
Эдыт Сёдэргран
Ду Фу
Эрлінг Кітэльсен
Ўільям Блэйк
Уладзімір Маякоўскі
Томас Вянцлава
Гунар Экелёф
Вільгельм Мюлер
Анакрэон
Энхедуанна
Архілох
Срэчка Косавел
Фернанду Песоа
К. І. Галчыньскі
Дзмітро Паўлычка
Захірыдзін Бабур
Джордж Гордан Байран
Джакама Леапардзі
Міхась Стральцоў
Георг Гайм
Стывен Крэйн
Стэйн Стэйнар
Назым Хікмет
Анна Ахматава
Цін Уевіч
К. К. Бачыньскі
Абу Убада аль-Бухтуры
Марына Цвятаева
Герыт Ахтэрберг
Нагапет Кучак
Іван Бунін
Поль Вэрлен
Нэлі Закс
Рой Кэмпбел
Сальваторэ Квазімада
М. Паўлікоўска-Яснажэўска
Багдан Ігар Антоныч
Антонія Поццы
Паўль Цэлан
Максім Багдановіч
Валадымір Сасюра
Уладыслаў Шленгель
Язэп Пушча
Мацей Казімір Сарбеўскі
Генры Лоўсан
Антоні Эдвард Адынец
Змітрок Бядуля
Нікалаус Ленау
Бертальт Брэхт
Уладзімір Арлоў
Эльза Ласкер-Шулер

**Блок**, А.

Б70 Выбраная паэзія / Аляксандр Блок; пер. з рускай Г. Ліхтаровіча. — Мінск : УП «Энцыклапедыкс», 2023. — 104 с. (Паэты планеты).

ISBN 978-985-7247-65-3.

Аляксандр Блок (1880–1921) – рускі паэт, драматург і літаратурны крытык. Адзін з заснавальнікаў і лідараў рускага футурызму. Вынаходнік новай паэтычнай мовы, неперяўзыдзены майстар наватвораў і нечаканых рыфмаў. Як мала хто, спалучаў у творчасці рэзкую правакацыйнасць і шчырую спавядальнасць. Папярэднік паэтычнага слэму, батлу і рэкламнага капірайтынгу.

Адрасуецца шырокаму колу чытачоў.

**ББК 84(4Рус)-5**

**УДК 821.161.1-1**

Серыя «Паэты планеты»

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Аляксандр Блок

**ВЫБРАНАЯ ПАЭЗІЯ**

Дызайн *Марціна Русецкага*
Рэдактар *Лявон Баршчэўскі*

+12

Падпісана ў друк 05.07.2023. Фармат 60×90 1/32.
Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ул.-выд. арк. 2,66. Ум. друк. арк. 3,25.
Наклад 99 асобнікаў. Замова № 951.

УП «Энцыклапедыкс».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка
друкаваных выданняў № 1/266 ад 3.04.2014.
Вул. Кульман 21-Б, офіс 108, 220030, Мінск.

Вытворчае даччынае ўнітарнае прадпрыемства
«Друкарня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка
друкаваных выданняў № 2/18 ад 26.11.2013.
Пл. Свабоды, 23-103, 220030, г. Минск.